# Распараджэнне
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

II жніўня 2022 г. № I50рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2022 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 2 972 577,01 рубля на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
11.08.2022 № 150рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

11 сакавіка 2022 г. пратакол № 1 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве Брэсцкага аблвыканкама:

Драгічынскаму райвыканкаму на першачарговыя рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на аб’екце ”Сядзібна-паркавы ансамбль у в.Закозель Драгічынскага раёна. Рэстаўрацыя капліцы“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 300 000 рублёў;

Пружанскаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб’екце ”Палацавы комплекс у г.п.Ружаны Пружанскага раёна. Кансервацыя з элементамі рэстаўрацыі фрагментаў галоўнага корпуса і аркад з вылучэннем чэргаў“. 1 чарга – паўночна-ўсходняя аркада“:

за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 335 339 рублёў;

за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 657 238,01 рубля;

па хадайніцтве Гродзенскага аблвыканкама:

Ашмянскаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб’екце ”Кансервацыя з фрагментарнай рэстаўрацыяй і выкарыстаннем руін былога замка Сапегі з фрагментамі абарончых збудаванняў у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна. Паўночна-ўсходні корпус“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 1 000 000 рублёў;

Смаргонскаму райвыканкаму на рэканструкцыю з рэстаўрацыяй былога будынка стайні ансамбля былога палаца Агінскіх за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 130 000 рублёў;

Шчучынскаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб’екце ”Бягучы рамонт даху і фасадаў матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі ”0“ – ”Свята-Раства-Багародзіцкая царква-крэпасць абарончага тыпу“ (1524 год) у в.Мураванка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці“ за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 550 000 рублёў.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

Н.У.Карчэўская